актыўна ўздзейнічаюць на працэсы, што адбываюцца ў Сусвеце; іх гарманічныя рытмы, падобныя да гарманічных гукаў, вызначаюць і рэгулююць жыццё на Зямлі. У фізіцы, хіміі, біялогіі знойдзена універсальнасць вагальных хвалявых працэсаў, што саманараджаюцца, узгодненых аўтахваляў пры самаарганізацыі матэрыі (узнікненні структур ў хаосе). Гэтыя адкрыцці аб'ядноўвае новы актуальны кірунак мыслення — сінергетыка.

Ідэяй адзінства макра- і мікракосмасу, думкай аб чалавеку, які змяшчае ў сабе ўсе прыродныя стыхіі і энергіі, прасякнута сучаснае мастацкае мысленне. Гэтая канцэпцыя знаходзіць шматграннае ўвасабленне ў сучасным музычным мастацтве і праяўляецца на розных узроўнях арганізацыі мастацкага цэлага: на ўзроўні ідэйнай задумы, тэматычнага выражэння, кампазіцыйнага метаду. Музыка ў новым разуменні адлюстроўвае адпаведнасць абстрактнага музычнага рытму, рытму чалавечай душы.

У сувязі са з'яўленнем у мастацкай свядомасці новай парадыгмы, заснаванай на ўсведамленні музыкі як жывога космасу — акустычна матэрыялізаванага адзінага мнагамернага арганізму, фарміруюцца новыя адносіны да гуку як энерганосьбіта, а працэс мастацкай творчасці разглядаецца як непасрэдны дыялог кампазітара (мікракосму) з "сусветным розумам" (макракосмам).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Г.Г.Шымялевіч,**
*аспірантка кафедры беларускай*
*і сусветнай мастацкай культуры*

# ОРДЭРНЫ ЭКЛЕКТЫЗМ І НЕАКЛАСІЦЫЗМ У АРХІТЭКТУРЫ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX—ПАЧАТКУ XX ст.

Эклектыка — адвольнае спалучэнне выразных сродкаў розных эпох і стыляў — у другой палове XIX ст. была асноўным метадам архітэктуры, а ў пэўнай ступені і іншых відаў мастацтва. Пры вывучэнні мастацкай спадчыны гэтага

часу вялікую цікавасць для даследчыкаў уяўляе творчасць мастакоў і архітэктараў, якія на свой густ, кіруючыся модай, патрабаваннямі заказчыка ці іншымі меркаваннямі, выбіралі і прымянялі элементы і прыёмы, характэрныя для мастацтва мінулых эпох – сярэднявечча (так, у эпоху эклектыкі ўзнікла плынь неаготыкі), новага часу (з'явіліся неабарока і інш.), нават нееўрапейскіх культур ("маўрытанскі" стыль).

Нельга не пагадзіцца з агульнапрынятым меркаваннем, што эклектыка ўяўляе сабой крызіс стылю. Сярод мастацтвазнаўцаў, гісторыкаў архітэктуры і культуролагаў існуе меркаванне, што гэтая крызісная сітуацыя была своеасаблівай рэакцыяй на татальнае панаванне ў мастацкай культуры класіцыстычных формаў (стыль "ампір"). У пачатку XIX ст. класіцызм быў распаўсюджаны ва ўсіх сферах; кожны будынак павінен быў формай нагадваць старажытнагрэчаскі храм; антычныя матывы пераважалі ў дэкаратыўным мастацтве і іншых формах творчасці.

Найважнейшым элементам класіцыстычнага метаду было выкарыстанне ордэрных формаў. Ордэр як канструктыўна-эстэтычная сістэма, дэталёва ўнармаваная і ўзведзеная ў ранг універсальнага ўзору (лацінскае слова *order* азначае "парадак"), у той час складаў аснову архітэктурнага дэкору. Аднак паступова пад уплывам эстэтыкі рамантызму пачаліся пошукі новай мастацкай выразнасці. Альтэрнатывай антычнай спадчыне павінен быў стаць мастацкі вопыт еўрапейскіх народаў пасля падзення Рыма, г. зн. перыядаў сярэднявечча і новага часу. Ці азначала гэта поўную адмову ад класіцыстычных формаў? Для адказу на гэтае пытанне звернемся непасрэдна да помнікаў XIX ст., якія захаваліся на тэрыторыі Беларусі.

Аналіз архітэктурных помнікаў другой паловы XIX – пачатку XX ст. паказвае, што такой катэгарычнай адмовы не было. У сярэдзіне XIX ст. у Беларусі шырока выкарыстоўваліся формы готыкі, часта браліся за ўзор



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

помнікі старажытнарускага дойлідства (і першая, і другая стылістычныя сістэмы, як вядома, практычна не выкарыстоўваюць ордэрных формаў). Тым не менш у арсенале дэкаратыўных прыёмаў архітэктараў заставаліся добра асвоеныя класіцыстычныя элементы – калоны, пілястры, антаблементы і інш. Спецыфіка эклектыкі як творчага метаду дазваляла іх выкарыстоўваць у дэкоры практычна любых па прызначэнні і мастацка-вобразным рашэнні збудаванняў.

Часцей за ўсё ў архітэктуры сярэдзіны і канца XIX ст. ордэрныя элементы прымяняліся па-за прывычнай сістэмай. У гэты час класічны комплекс "вертыкаль (калоны або пілястры) + гарызанталь (антаблемент)" распадаецца. Як правіла, з усяго комплексу архітэктар-эклектык запазычваў толькі асобныя формы. Статыстычны аналіз вялікай групы помнікаў, зафіксаваных у "Зборы помнікаў гісторыі і культуры Беларусі", г. зн. тых, што захаваліся да канца XX ст., паказвае, што часцей (больш за 30 прыкладаў) у азначаны перыяд прымяняўся такі элемент ордэрнай сістэмы, як пілястры.

Пілястры спрошчанай трактоўкі ордэра (без канелюраў, аднак з яўна выражанымі капітэлямі) побач з простымі лапаткамі былі ў гэты час асноўным сродкам вертыкальнага члянення фасадаў. Цікава, што такія пілястры сустракаюцца ў дэкоры збудаванняў рознай стылістычнай "афарбоўкі": імі ўпрыгожаны, напрыклад, і помнік рэтраспектыўна-рускага стылю Мікалаеўская царква ў в.Слабодка (Бешанковіцкі раён Віцебскай вобласці), і касцёл у в. Гожа (Гродзенскі раён) — тыповы ўзор беларускай вясковай неаготыкі. Такіх прыкладаў можна прывесці шмат.

У сістэме дэкору эклектычнай архітэктуры сярэдзіны і канца XIX ст. ордэрныя элементы не з'яўляліся асноўнымі. Разгледзім для прыкладу тыповы помнік эклектыкі – сядзібу ў Лынтупах (Пастаўскі раён Віцебскай вобласці). Дэкор сядзібнага дома надзвычай разнастайны. Гэта ляпныя разеткі і маскароны, пілястры, калоны, руст,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нішы; вокны ўпрыгожаны лучковымі і трохвугольнымі сандрыкамі, сцены вянчаюць фрыз і карніз на мадульёнах. Ордэрныя формы адыгрываюць пэўную ролю ў стварэнні агульнага адчування багатай пластыкі і стракатасці, аднак галоўная роля адводзіцца тут іншым выразным сродкам. Аналагічным прыкладам можа служыць сядзібны дом у Хойніках, пабудаваны на мяжы XIX і XX стст.

Такім чынам, формы ордэра ў сярэдзіне і канцы XIX ст. працягваюць прымяняцца, але не маюць стылевызначальнай функцыі. Названыя вышэй помнікі (а таксама многія іншыя) даследчыкі адносяць да розных стылістычных плыняў. Найбольш трапна будзе назваць гэтую з'яву ордэрным эклектызмам і адзначыць, што ў сістэме вобразных сродкаў эклектыкі ордэрныя элементы сустракаюцца даволі часта, але адыгрываюць другасную ролю.

Згодна статыстыцы, ордэрны эклектызм найбольш характэрны для архітэктуры сярэдзіны і канца XIX ст., прычым часцей для культавых збудаванняў у сельскай мясцовасці. Можна меркаваць, што ў гэты перыяд ордэрныя элементы на нейкі час выходзяць з моды, а таму практычна не ўжываюцца ў архітэктуры гарадоў. Аднак напачатку XX ст. стаўленне да ордэрнай архітэктуры зноў мяняецца.

У 1900—1910-я гг. прымяненне ордэрнага і класіцыстычнага дэкору значна ўзрастае. Па-ранейшаму часта ў сельскай (культавай) і гарадской (жыллёвай) архітэктуры сустракаюцца ордэрныя элементы спрошчанай трактоўкі, аднак у найбольш рэпрэзентатыўных збудаваннях (мемарыяльная архітэктура, будынкі банкаў і камерцыйных устаноў) выкарыстоўваюцца класічныя элементы карынфскага, іанічнага ордэраў.

Калі ў ордэрным эклектызме XIX ст. пэўныя формы прымяняліся сапраўды бессістэмна, то ў пачатку XX ст. у архітэктуру вяртаецца адчуванне заканамернасцей, уласцівых класічнаму ордэру. Так, на працягу стагоддзяў у еўрапейскай архітэктуры пэўныя тыпы ордэраў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

звязваліся з тымі ці іншымі эмацыянальна-вобразнымі характарыстыкамі: дарычны ордэр яшчэ ў антычнасці называлі строгім, іанічны — пяшчотным, карынфскі — урачыстым. У Беларусі пачатку XX ст. архітэктары ўсё часцей звяртаюцца да ўрачыстай мелодыкі карынфскага ордэра.

Яшчэ адным традыцыйным прыёмам ордэрнай архітэктуры, вядомым з часоў рымскага Калізея, з'яўляецца выкарыстанне пілястраў розных ордэраў пры паярусным чляненні фасадаў для іх рытмічнай арганізацыі, а таксама для ўсталявання паярусных градацый і сувязей. Гэтая класічная схема выкарыстана пры будаўніцтве Мікалаеўскага касцёла (1908) у г. п. Свір Мядзельскага раёна Мінскай вобласці, дзе галоўны фасад падзяляецца на два ярусы, прычым ніжні, на выгляд больш масіўны, чляніцца пілястрамі тасканскага ордэра, а верхні, больш пышны і лёгкі, — карынфскімі пілястрамі.

Нельга не звярнуць увагу і на прасторавую кампазіцыю збудаванняў. Як вядома, для класіцызму характэрная восевая і нават цэнтральная сіметрыя. Для эклектыкі ж сіметрычная кампазіцыйная пабудова з'яўляецца неабавязковай. Па нашых назіраннях, творы ордэрнага эклектызму, як правіла, маюць асіметрычную кампазіцыю, але там, дзе ордэрныя элементы становяцца асновай вобразнасці, мы часта сустракаем і строгую сіметрыю. Такі сіметрычны план мае, напрыклад, сядзібны дом у в. Опса Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці, пабудаваны ў 1904 г. і ўпрыгожаны калонным порцікам. Кампазіцыя гэтага твора ўзыходзіць да знакамітых паладыянскіх палацаў.

Нарэшце, у 1900—1910-я гг. у Беларусі з'яўляецца шэраг выдатных твораў архітэктуры, у якіх дэкор быў заснаваны выключна на выкарыстанні прыёмаў, запазычаных у антычнасці. Відавочна, што гэта было праяўленнем агульнаеўрапейскай плыні (так званы стыль "нэагрэк"). У якасці прыкладаў назавём Камерцыйны банк у Гомелі (1901, архітэктар С.Шабунеўскі), капліцу ў в.Моладава Іванаўскага раёна (1905—1908, архітэктар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Т.Раствароўскі, паводле прызначэння—пахавальня, што ўваходзіла ў сядзібны комплекс), асабняк у Бабруйску па вул. Пушкіна, 12 (1912). Дэкаратыўна-канструктыўная сістэма гэтых помнікаў не абмяжоўваецца спарадычным выкарыстаннем асобных элементаў ордэра. Тут усё, ад прасторавай кампазіцыі да арнаментальных матываў, адпавядае класіцыстычнай эстэтыцы. Такая стылявая цэласнасць, бясспрэчна, спрыяла стварэнню мастацкага вобраза названых твораў, і ў іх дачыненні можна весці гаворку пра стылістычны кірунак у архітэктуры — неакласіцызм.

Неакласіцызм атрымаў у Беларусі распаўсюджанне параўнальна позна (адносна іншых неастыляў), але не выходзіў з моды вельмі працяглы час. Сціплыя і стрыманыя, але ў той жа час узвышаныя і вытанчаныя неакласічныя формы выглядалі найбольш адпаведным увасабленнем ідэі мемарыяльнага збудавання і нават храма. Пацвярджэннем таму служаць Пакроўскі сабор у Баранавічах (1924—1931) і мемарыяльны знак на месцы Мілавідаўскай бітвы, узведзены ў 1930—1933 гг. у выглядзе чатырох тасканскіх калон, увянчаных сферычным купалам. Як бачым, неакласіцызм быў актуальным аж да 1930-х гг. на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

Падводзячы вынік, можна адзначыць, што элементы класіцызму ў цэлым і ордэрнай архітэктуры ў прыватнасці не страчвалі сваёй актуальнасці ні на працягу XIX, ні ў пачатку XX стст. Гэта можна тлумачыць моцнымі пазіцыямі, якія меў класіцызм у нашай краіне на мяжы XVIII—XIX стст.: нават праз сто гадоў выкарыстанне знаёмых формаў у архітэктуры ўспрымалася як належнае. У сярэдзіне і канцы XIX ст. прымяненне ордэрных элементаў было не больш чым адным з многіх кампанентаў творчага метаду эклектыкі, ордэрнага эклектызму. Пазней, у пачатку XX ст., на якасна новай эстэтычнай базе пачалося фарміраванне неакласіцыстычнага стылістычнага кірунку, які даў у Беларусі плён у форме шэрага выдатных помнікаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ